«Народная Воля» в Facebook www.facebook.com/nv.online.info,
в Vkontakte www.vk.com/nvonlineinfo

На простор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 41 (4601)

4 чэрвеня 2021 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.



Народная Воля

ЛІСТ З РЭДАКЦЫІ

Не згубім «Народную Волю»!

Шаноўныя чытачы!
Паважаныя валанцёры!
Усе, хто можа ўзяць удзел у выратаванні «Народнай Волі»!

Наступіў час, калі лёс незалежнай газеты залежыць толькі ад Вас. Паколькі ўжо каторы месяц выданне не мае даходаў ад рэалізацыі праз «Белпошту» і «Белсаюздрук», то рэдакцыя ў чарговы раз звяртаецца да Вас, дарагія прыхільнікі свабоднага слова, з просьбай: дапамажыце!


Толькі разам мы зможам уратаваць «Народную Волю». Ёсць некалькі спосабаў пералічыць грашовыя сродкі (даём рэквізіты ў рускай транскрыпцыі):

1.Через ЕРИП:
СМИ – Н (просто буква) – «Народная Воля» – Добровольные взносы.
2.Через БАНК:
ИЧУП «Народная Воля». 22030 г.Минск, ул.Энгельса, 34а
р/с BY08 РJCB 3012 0065 3510 0000 0933,
Код РJCBBY2X, ЦБУ 113 «Приорбанк» ОАО, г.Минск
УНП 100961759, ОКПО 37381505

Загадзя выказваем шчырую ўдзячнасць!

Вы — з «Народнай Воляй», «Народная Воля» — з Вамі!

ГОРКІЯ СЛЁЗЫ



«Францішак прасіў, каб тата з намі пайшоў на вуліцу»

Павел Севярынец у турме сустрэўся з жонкай і сынам.

25 мая старшыня аргкамітэта па стварэнні партыі БХД быў асуджаны на 7 гадоў зняволення па абвінавачанні ў падрыхтоўцы масавых беспарадкаў. Пасля суда яго жонцы Вользе далі 2 гадзіны на спатканне з мужам – сустрэчу праз шкло з размовай па тэлефоне. На спатканне Вольга ўзяла 3-гадовага сына Францішка, якога Павел не бачыў з 7 чэрвеня мінулага года, калі яго затрымалі пасля мітынгу ля Камароўскага рынку.

Паводле слоў Вольгі Севярынец, яны з мужам не гаварылі аб прысудзе і працэсе, а засяродзіліся на агульных сямейных справах.

– *Францішак ужо добра гаворыць, і яны з Паўлам размаўлялі праз трубку. Сын рэагаваў, адказваў, усміхаўся і потым вельмі прасіў тату, каб ён з намі пайшоў на вуліцу пагуляць. Але неяк яму патлумачылі, што сёння не атрымаецца,* – сумна ўспамінае Вольга.

Што казаў Павел Францішку, Вольга не чула, але пра некаторыя рэчы цяпер можа здагадацца.

– *Раптам Францішак з прагулкі прынёс мне кветкі. Пытаюся: хто цябе навучыў? Дык ён кажа, што тата. То бок гэта Павел навучыў яго дарыць маме кветкі,* – смяецца Вольга.

Вольгі прызнаецца, што наведванне магілёўскай турмы стала для іх сына і праблемным досведам.

– *Пачаў гуляць у турму. Да нас заходзіць суседка, дык зачыняе за ёй дзверы і кажа: «Усё, ты ў турме». Не ведаю, што з гэтым рабіць,* – дзяліцца Вольга Севярынец.

Пра настрой Паўла Вольга кажа так:

– *Ён унутрана сабраны, спакойны. Сказала б, што частка яго ўжо жыве ў турме, мяркую, абдумвае тое, што там будзе. Але застаецца па-ранейшаму духоўна моцным, як крэмень. Перадаваў усім, хто яго падтрымлівае, вялікі дзякуй.*

(Радыё Свабода)

В ФОКУСЕ

Что думают депутаты про амнистию?

Как уже сообщала «Народная Воля», еще в начале года представители информационно-аналитического учреждения «Круглый стол демократических сил» во главе с **Юрием Воскресенским** подготовили законопроект об амнистии и направили его в Палату представителей – по электронной почте, на персональные рабочие электронные ящики каждого депутата.

Однако реакции от тех, кто заседает в Овальном зале, не последовало – некоторые депутаты заявили, что в глаза не видели такого законопроекта. Вероятно, просто не все из них проверяют свою электронную почту. На послание из всех депутатов ответил лишь один (!) – член постоянной комиссии по законодательству **Виталий Уткин**.

Чуть больше месяца назад Юрий Воскресенский повторно направил каждому депутату уже распечатанный пакет документов.

В законопроекте, напомним, предлагается амнистировать и тех, кого признали политзаключенными, – к проекту прилагался список из 425 имен людей, которые сейчас находятся за решеткой. Среди них – сын и отец **Виктор и Эдуард Бабарико**, гражданская активистка **Мария Колесникова**, художник **Алесь Пушкин** и многие другие. Сейчас в списке уже 515 имен и фамилий.

«Мы направили законопроект в парламент, потому что главная проблема сегодня – это напряжение в обществе, – объясняет «Народной Воле» Юрий Воскресенский. – *В условиях агрессивного внешнего давления как никогда нужна внутренняя консолидация. Надеемся, что и оставшиеся депутаты выскажут свою гражданскую позицию.*

Думаю, взаимодействуя с властью по данному вопросу, мы выйдем на какое-то общее решение вопроса, которое устроит всех: и гражданское общество, и силовые структуры, и даже беглую оппозицию. Освобождение людей будут приветствовать все...»

Что сегодня говорят депутаты по поводу амнистии? И почему тянут с реакцией на важный законопроект?

Как стало известно «Народной Воле», на днях на адрес информационно-аналитического учреждения «Круглый стол демократических сил» прислали ответ лишь двое депутатов – снова **Василий Уткин** и глава Либерально-демократической партии, зампред комиссии по международным делам **Олег Гайдукевич**.

Ответ Уткина – совершенно пустой: *«Изложенный вами вопрос находится в четко урегулированных рамках правового поля (...) решение данной ситуации возможно в пределах действующего законодательства с учетом основополагающих принципов защиты прав и законных интересов всех граждан Республики Беларусь».*

Гайдукевич поддерживает амнистию.

«Амнистия – это всегда и во все времена хороший способ для снятия напряженности в обществе, проявления милосердия, но только в рамках Закона, – пишет Гайдукевич. – *Изучив, предложенный Вами проект Закона Республики Беларусь «Об амнистии», считаю, безусловно, под амнистию не должны попадать лица-организаторы, призывающие к массовым беспорядкам, либо тесно сотрудничавшие с западными спецслужбами или государствами, либо те, кто призывал к санкциям в отношении Республики Беларусь, фактически предав свою страну.*

Вместе с тем, как депутат Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь, председатель Либерально-демократической партии, я готов к конструктивному сотрудничеству, направленному на единение белорусского народа».

Правда, Олег Гайдукевич не уверен, что законопроект об амнистии будет рассмотрен в самое ближайшее время.

«На этой неделе депутаты работают в своих избирательных округах, – прокомментировал депутатскую активность «Народной Воле» Гайдукевич. – *Только в понедельник мы соберемся, и будет понятно, какие вопросы успеем рассмотреть на этой весенней сессии. Но не думаю, что с этим законопроектом всё сложится быстро, не вижу я пока предпосылок...»*

Вера ВИР.

СЛЫШАЛИ?

Генсек НАТО и премьер Британии поддержали жесткие санкции против режима Лукашенко

Ответ властям Беларуси будет обсуждаться 14 июня на саммите Альянса.



Генеральный секретарь НАТО **Йенс Столтенберг** и премьер-министр Великобритании **Борис Джонсон** поддержали жесткий ответ властям Беларуси за действия, которые привели к аресту оппозиционного журналиста, сообщает «Голос Америки».

Выступая на совместной пресс-конференции в Лондоне, которая прошла в резиденции премьер-министра Великобритании, Столтенберг заявил, что принудительная посадка гражданского самолета и арест журналиста, находившегося на борту лайнера, осуществленные властями Беларуси в прошлом месяце, являются нарушением международных норм и правил. Он призвал к немедленному освобождению **Романа Протасевича** и его девушки **Софьи Сапеги**.

Столтенберг сказал, что он приветствует санкции, введенные против Минска Великобританией, Европейским Союзом и другими союзниками НАТО. Джонсон добавил, что сейчас важно убедиться в полном выполнении этих санкций и, возможно, усилить их. Британский премьер назвал этот инцидент «ужасающим и возмутительным», подчеркнув важность совместных действий союзников против белорусских властей.

30 государств-членов НАТО опубликовали короткое заявление с осуждением действий официального Минска, однако не включили в окончательный текст резолюции упоминание о санкциях, к чему призывали, в частности, балтийские государства и Польша.

Столтенберг сказал, что этот вопрос обязательно будет обсуждаться на саммите НАТО, который пройдет 14 июня в Брюсселе.

С МОЕЙ КОЛОКОЛЬНИ



Елена МОЛОЧКО

ПЕПЕЛ И АЛМАЗ, или Зачем Ольгу Нефедову отправили в космос

На фоне чудовищных, макабрических новостей последних дней – вынужденной посадки ирландского самолета в Минске, ареста блогера Романа Протасевича, попытки Степана Латыпова покончить жизнь самоубийством прямо во время судебного процесса – информация о назначении артистки **Ольги Нефедовой** художественным руководителем Национального академического театра имени Янки Купалы вызывает даже улыбку. Горькую, но тем не менее... Министерство культуры пошутило? Министерство культуры ставит такие опасные эксперименты – то с Большим театром, то вот с Купаловским... Назначить худруком театра артистку второго плана – это как с бухты-барахты отправить в космос техника. На земле, в команде, этот человек незаменим. А из космического пространства и сам не вернется, и корабль угробит – у него ведь ни знаний, ни специальной подготовки, ни, извините, таланта.

Тем не менее О.Нефедову отправили покорять просторы театральной Вселенной во главе коллектива, которого, практически, нет, которой еще предстоит собрать по пути. Колоссальной трудности задача, если иметь в виду, какие небогатые у нас артистические кладовые.

Впрочем, я отдаю должное кое-каким способностям Ольги. Она, конечно, человек с лидерскими качествами: зычный голос, завидная стать, эмоциональный – не видя берегов – напор. Но этого мало для художественного руководства коллективом. Катастрофически мало! Я, например, не помню значительных ролей артистки в Купаловском театре, где она работает с 1992 года. Вернее, я видела Нефедову на сцене в некоторых спектаклях – «Выкраданне Еўропы, альбо Тэатр Уршулі Радзівіл», «Ноч на Калядх», «Пінская шляхта». И она была там, что называется, к месту – такая терпкая приправа, резкая краска. Очень нужная – для эпизодов... Я не иронизирую. У каждого свое место в искусстве. Мало таланта? Претензии к господу Богу. Уж точно не к режиссеру Николаю Пинигину. В конце концов, Ольга могла бы и поменять сцену, уйти в другой театр, если бы дело было только в «плохом» режиссере, который не видит такой алмаз в труппе. Но она не уходила. Или артистку никуда не приглашали?.. Она подрабатывала на телевидении, была ведущей на радио, кстати, голос ее – низкий, загадочный – быстро запоминался.

Но в последние месяцы Нефедова запомнилась другим. Многими интервью, в которых осуждала (я сказала бы, исходила ядом и гневом) своих бывших коллег, покинувших театр в знак протеста против сфальсифицированных выборов и последовавшего после них насилия. А также некрасивыми слезами перед Александром Лукашенко, когда он приходил смотреть новую «Паўлінку» в Купаловский театр. Режиссер Пинигин, конечно, поставил бы эту сцену – «верноподданнический плач перед хозяином» – иначе. Но его не было, а сама артистка как смогла, так и разыграла. Получилось жалкое зрелище. Очень неловкое, нелепое. Потому что перебор... А талант – это прежде всего чувство меры.



Чувство достоинства. Но не за талант теперь отмечают государственными наградами и карьерой, а за преданность. Вскоре Нефедова получила медаль Франциска Скорины. А теперь вот должность худрука театра.

Сочувствую Купаловскому театру – его пока можно закрывать на амбарный замок. Но если произойдет невозможное и в новом сезоне на его сцене появится ошеломляюще талантливый спектакль, первая поздравлю с успехом художественного руководителя. Так что не будем пока посыпать голову пеплом, а подождем чуда. Надежда только на чудо...

ЛІЧБЫ

Сумная статыстыка

Праваабаронцы падвялі вынікі мінулага месяца і адзначылі, што ў маі ўлады працягвалі актыўна ўжываць крымінальны пераслед грамадзян па палітычных матывах.

Паводле дадзеных праваабаронцаў, на працягу месяца судамі былі вынесены прысуды ў дачыненні да не менш як 109 чалавек па палітычна матываваных крымінальных справах.

За май былі затрыманы 332 чалавекі, вынесены каля 240 судовых пастаноў: у 160 выпадках накладзены адміністрацыйны арышт, у 77 – штраф.

Як інфармуе Генеральная пракуратура, за перыяд са жніўня 2020 года было распачата больш за тры тысячы крымінальных спраў за парушэнне парадку правядзення масавых мерапрыемстваў і акцый пратэсту.

Сёння ў няволі знаходзяцца 454 палітвязні, і іх колькасць працягвае павялічвацца.

Віктар ШПАК.

САЛІДАРНАСЦЬ

На аднаўленне Будслаўскага касцёла ўжо сабралі каля 635 тысяч рублёў



Нагадаем, што раніцай 11 мая загарэўся касцёл у Будславе, у якім знаходзіцца адна з найважнейшых святынь Беларусі – абраз Маці Божай Будслаўскай.

Пажар удалося патушыць, але выгараў і абваліўся дах. Зараз працягваецца збор сродкаў на аднаўленне храма.

Паводле слоў старшыні камісіі па адбудове касцёла біскупа **Аляксандра Яшэўскага**, сёння ідзе гаворка не толькі пра аднаўленне знішчанага агнём даху, але і пра поўную рэканструкцыю санктуарыя, што можа заняць некалькі гадоў.

«Ужо былі разабраны пашкоджаныя агнём канструкцыі, праведзена сартаванне чорнага і каляровых металаў і вядзецца даследаванне канструкцый з мэтай падрыхтоўкі праекта новага даху, – кажа Аляксандр Янушэўскі. – Паралельна праводзяцца працы па накрыцці касцёла часовым дахам, каб зберагчы яго ад разбуральнага ўздзеяння атмасферных ападкаў. Усе працы вядуцца пад наглядам навуковага кіраўніка ***Андрэя Карпука*** *і па ўзгадненні з Міністэрствам культуры.*

На дадзены момант таксама нашым Апостальскім адміністратарам падпісаны ліст да кіраўніцтва краіны з просьбай аб выдзяленні фінансавай дапамогі з бюджэтных сродкаў».

Біскуп дадае, што, паводле папярэдніх ацэнак, кошт новага даху святыні можа скласці каля **2,2 мільёна рублёў**.

Сяргей ЗАБЛОЦКІ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Маці Максіма МАРХАЛЮКА:

«Да апошняга будзем верыць, што сын жывы...»

Амаль чатыры гады прайшло з таго часу, як у вёсцы Новы Двор Свіслацкага раёна бясследна знік 11-гадовы хлопчык.

Нагадаем, што **Максім Мархалюк** знік вечарам 16 верасня 2017 года. Апошні раз яго бачылі каля шалаша, дзе гулялі дзеці. Школьнік сказаў, што пойдзе ў лес за грыбамі, ля шалаша ён пакінуў свой веласіпед. Дадому так і не вярнуўся.

Аператыўна знайсці хлопчыка не ўдалося, ужо праз суткі да пошуку падключыліся валанцёры пошукава-выратавальных атрадаў.

23 верасня адбылася ўнікальная пошукавая аперацыя, у якой бралі ўдзел больш за дзве тысячы чалавек: міліцыя, МНС, валанцёры Чырвонага Крыжа, розных пошукавых атрадаў. Беларусы прыязджалі ў Новы Двор з усіх куткоў краіны.

Следчыя правярылі шмат розных версій, якія вылучалі і мясцовыя жыхары, і валанцёры, і нават... экстрасэнсы. Людзі казалі пра тое, што хлопчыка скралі або ён патануў у балотах пушчы. Альбо, спалохаўшыся дзікіх звяроў, уцёк у лес і там згубіўся. Былі версіі, што школьнік трапіў за мяжу ці як быццам проста ўцёк з дому.

Па факце знікнення хлопчыка 26 верасня 2017 года была адкрыта крымінальная справа, а 2 кастрычніка Максіма Мархалюка абвясцілі ў міжнародны вышук.

На жаль, хлопчыка так і не знайшлі. Шанцаў, што ён жывы, вельмі мала, але гісторыя ведае выпадкі, калі зніклыя дзеці знаходзіліся і праз дзесяцігоддзі. Бацькі Максіма таксама працягваюць жыць надзеяй.

– Крымінальная справа, наколькі мне вядома, не закрыта, але ніякай новай інфармацыі няма, – *распавяла «Народнай Волі» маці хлопчыка Валянціна Мікалаеўна.* – Я нават і не ведаю, колькі ў такім стане



справа можа знаходзіцца. Але ўжо ніхто не прыязджае, не апытвае...

Не памятаю, калі апошні раз размаўляла са следчым па гэтай справе, хаця што ён можа сказаць, калі новых абставін не з'явілася? Калі нешта будзе, то самі выйдуць на сувязь.

– Як вы трымаліся ўвесь гэты час?

– Складана сказаць, што дапамагло падтрымліваць сілы. Словамі гэта проста не апісаць. Але не пажадаю нават ворагу перажыць тое, што перажылі за гэты час мы з бацькам Максіма.

Старэйшы сын (ён ваенны) служыць у Барысаве, але, безумоўна, прыязджае, таксама падтрымлівае.

– Калі Максім знік, з гэтай нагоды было вельмі шмат версій. А самі вы якой прытрымліваецеся?

– Ужо столькі часу прайшло і столькі версій было, што пачынаеш не верыць ні ў тое, ні ў іншае. Пачынаеш сумнявацца.

У інтэрнэце ў пошукавыя групы час ад часу мы звяртаемся, даём абвесткі, што шукаем Максіма, але выніку пакуль няма.

– Кажуць, што і экстрасэнсы далучаліся да пошуку...

– Адразу пасля таго, як сын знік, іх было вельмі шмат. Падавалі сябе такімі разумнымі, як быццам усё ведалі, а аказвалася – пустыя словы. Толку ад гэтых экстрасэнсаў было нуль! Але ж калі прыходзіць гора, то чапляешся за што заўгодна, каб толькі з'явілася нейкая надзея.

І хачу сказаць, што мы з бацькам да апошняга будзем верыць, што сын жывы...

Алесь СІВЫ.

ПИСЬМО ИЗ КИЕВА

У Зеленского открылись глаза на «чудаковатого соседа»

Украина очнулась. Можно сказать, впервые и на словах, и на деле заняла весьма жесткую позицию по отношению к специфическим и неадекватным, по меркам цивилизованного мира, действиям человека, который силой удерживает власть в Беларуси.

До этого белорусскому диктатору всё сходило с рук. Предыдущие четыре президента Украины закрывали глаза на «чудаковатого соседа», предпочитая выстраивать с ним разного рода торговые схемы. Неожиданно для Александра Лукашенко Владимир Зеленский повел себя по-другому. Его позиция позволила ближайшим к Синеокой демократическим странам консолидированно выступить по отношению к безрассудным действиям правителя Беларуси. Украина, Польша, Литва, Латвия, несмотря на собственные экономические издержки, закрыли свое воздушное пространство для полетов белорусских самолетов в ответ на инсценировку чрезвычайной ситуации на борту ирландского авиалайнера, летевшего из Греции в Литву через воздушное пространство Беларуси, целью которой был арест оппозиционного блогера.

Вероятно, белорусские спецслужбы просчитывали жесткую реакцию западных стран на свою безумную выходку, но не рассчитывали, что Украина, ранее всё спускавшая на тормозах, выступит с европейцами единым фронтом. Действительно, если бы Украина проигнорировала позицию цивилизованных стран, то санкции, направленные против белорусских авиаперевозчиков, не имели бы должного эффекта. Было бы немного болезненно, но терпимо. А сейчас им открыт только один воздушный коридор – через Россию, но фактически в Европу, даже в страны, которые пока не присоединились к санкциям, уже не попасть. Летать туда через Россию экономически нецелесообразно.

Для белорусских элит теперь закрыт путь в Европу, а летать в Турцию и Египет стало значительно дольше и дороже. Позиция Украины, судя по всему, очень разозлила официальный Минск. Начался откровенный экономический шантаж. Беларусь заявила о прекращении поставок бензина и дизтоплива в Украину. От поставок белорусской электроэнергии Украина отказалась сама.

Вслед за этим официальный Минск ввел индивидуальное лицензирование на импорт ряда украинских товаров. Эти санкции коснутся кондитерских изделий, шоколада, соков, пива, плит ДСП и ДВП, обоев, туалетной бумаги и упаковки, кирпича, керамической плитки, стеклянных ампул, сельхозтехники для посева, стиральных машин и мебели.

В Министерстве экономики Украины сочли такие действия необоснованными и дискриминационными; они, безусловно, создадут определенные трудности, но Украина их сможет нивелировать. А вот сможет ли Беларусь найти новые рынки для сбыта своей продукции, выручка от реализации которой формирует львиную долю белорусского бюджета? После заявления об ограничении продажи Украине дизтоплива и бензина из Беларуси, занимавшего достаточно высокий процент украинского рынка, цена на топливо в Украине за последнюю неделю осталась неизменной, хотя власти Беларуси прогнозировали дефицит и рост цен в этом сегменте украинского рынка. Очередной просчет? Что касается решений по лицензированию товаров, то, как заявили в Министерстве экономики Украины, сейчас проводятся *«консультации с производителями по устранению негативных последствий дискриминационных действий правительства Беларуси»*.

Чего следует ожидать от официальной Украины человеку, называющему себя руководителем Республики Беларусь?

Во-первых, украинский МИД подготовил для Совета национальной безопасности и обороны Украины (СНБО) пакет индивидуальных санкций. Об это заявил заместитель министра иностранных дел Украины Евгений Енин: *«Санкции будут распространяться на представителей власти, которые причастны к предполагаемой фальсификации выборов и насилию в отношении мирных граждан. Санкционный пакет уже передан на рассмотрение в Совет национальной безопасности и обороны. МИД надеется, что это будет сделано в ближайшее время»*. Такого себе даже Петр Алексеевич Порошенко, якобы самый демократичный и проевропейский украинский президент, не позволял. Можно констатировать, что Украина при Зеленском концептуально изменилась и начала играть на опережение.

Во-вторых, 3 июня Верховная Рада приняла заявление, в котором решительно осудила действия властей Республики Беларусь по принудительной посадке пассажирского самолета компании Ryanair и задержанию Романа Протасевича, призвала немедленно освободить их и всех политических заключенных, а также остановить произвол и пытки в отношении белорусских граждан, содержащихся под стражей. Кроме того, украинские парламентарии призвали власти Беларуси гарантировать уважение прав человека в соответствии с международными обязательствами.

«Верховная Рада Украины подтверждает полную солидарность со своими международными партнерами, прежде всего государствами-членами Европейского Союза и США, в том числе по вопросу прекращения воздушных сообщений с Республикой Беларусь», – говорится в заявлении.

В-третьих, по словам главного украинского переговорщика по ситуации с оккупированным Донбассом, первого президента Украины Леонида Кравчука, сейчас идет поиск альтернативной Минску площадки для переговоров. Проводятся консультации с ОБСЕ. *«Учитывая ту ситуацию, ту диктаторскую линию, то диктаторское поведение, которое демонстрирует самопровозглашенный президент Лукашенко, мы не можем рассматривать вопрос об обсуждении тех проблем, которые называют минской площадкой»*, – констатировал Леонид Кравчук. Кроме этого, он отметил, что, по его мнению, Беларусь теперь не просто соседнее государство, а сателлит России.

В-четвертых, последовал невероятно жесткий ответ заместителя главы украинского МИД Эмины Джапаровой на *«высказывания господина Лукашенко относительно обращения к России и Путину с возможным открытием авиарейсов в оккупированный Крым»*: *«Мы будем действовать мгновенно против любых попыток легитимировать оккупацию Крыма Россией, против любых попыток навязать контакты с так называемыми «ЛНР» или «ДНР». И если хоть один самолет белорусской авиакомпании окажется на территории оккупированного Крыма, санкции будут неизбежны со всеми вытекающими последствиями»*. Джапарова подчеркнула, что вся полнота ответственности за санкции и ограничения государствами мира, в том числе Украиной, воздушного сообщения с Беларусью и за неудобства, которые испытывают из-за этого граждане Беларуси, лежит на Лукашенко.

«От необдуманных и провокационных действий Лукашенко уже страдают обычные белорусы, которые нам очень близки. Мы с большим уважением к ним относимся и солидаризируемся с их усилиями отстоять свои права и свободы. Есть международное право, согласно которому Крым и Донбасс – это Украина. Россия грубо нарушила международное право, оккупировав Автономную Республику Крым и развязав агрессию на востоке Украины, за что будет нести ответственность. Если Лукашенко хочет разделить эту ответственность с Путиным на одной скамье подсудимых в Гааге и еще больше усилить собственную международную изоляцию, это, конечно, его личный выбор, но, убеждена, не выбор дружественного Украине белорусского народа», – резюмировала Эмина Джапарова.

В-пятых, секретарь СНБО Игорь Данилов, на рассмотрении которого сейчас находятся предложения украинского МИД по санкциям, направленным против белорусских чиновников, после встречи с главным советником президента Литовской Республики по вопросам национальной безопасности Дариусом Кулешюсом, на которой обсуждались совместные военные действия Беларуси и России, заявил: *«События в Беларуси стали вызовом не только для Европы, но и для всего мира. Захват самолета Ryanair в Беларуси имеет все признаки операции российских спецслужб»*.

Ситуация в целом складывается следующим образом. В результате действий Лукашенко Украина больше не считает Беларусь добрососедским государством и расценивает действия узурпатора как несущие потенциальную военную угрозу. Украина полностью солидарна в своих действиях с позицией ЕС, США и всего демократического мира относительно реакции на опасные действия Лукашенко.

Президент страны Владимир Зеленский считает, что теперь «сюрпризы» могут быть не только со стороны РФ: *«Сейчас очень опасная ситуация в Беларуси. Это наши северные границы. И мы понимаем, что Россия и Беларусь постоянно рассматривают и договариваются о важной геополитической и, наверное, оборонной сделке. После этого может быть действительно серьезное влияние России и серьезная координация и контроль белорусских вооруженных сил. Тогда мы можем рассматривать риск и с той стороны»*.

По сути, по мнению официальных государственных лиц стран – соседей Беларуси, получается, что в стремлении сохранить свою личную власть Александр Лукашенко поставил под угрозу мир и стабильность в регионе. И теперь соседям не приходится ждать от него мира и благополучия, а нужно воспринимать Беларусь как источник настоящей опасности. Судя по всему, конфронтация будет только нарастать...

Александр ЦЫНКЕВИЧ,
собственный корреспондент газеты «Народная Воля» в Украине.

Народная Воля

http://www.nv-online.info

4 ЧЭРВЕНЯ 2021 г.

Сяргей АНТОНЧЫК:

«За спінай улады ўсё больш і больш злачынстваў – гэта як ланцуговая рэакцыя, якую цяжка спыніць»

Лецішча Сяргея Антончыка ў вёсцы Перакопаўшчына на Стаўбцоўшчыне нагадвае сталічны Батанічны сад. Чаго там толькі няма! Адных вінаграднікаў – ажно шэсць, у спрыяльныя гады ўраджай гаспадар тачкамі вывозіць. Кветнікі, цяпліцы, вялікі сад – усё ў ідэальным парадку. Але праславілася Антончыкава сядзіба не земляробчымі дасягненнямі, а камянямі, якія… зладзілі недазволены пікет. Каб даведацца падрабязнасці з першых вуснаў, я завітаў у Перакопаўшчыну.

– Спадар Сяргей, пасля здарэння з вашымі камянямі я магу ўзгадаць толькі словы з Бібліі: «Калі мы замаўчым, дык камяні загалосяць». Як выглядае, у Беларусі ўжо і камяні не могуць маўчаць, сузіраючы ўсё тое беззаконне, якое адбываецца амаль штодня. Раскажыце, як з-за камянёў вы трапілі на лаву падсудных?

– Па-першае, я вельмі люблю камяні, у іх прысутнічае нешта пазачасавае. Малым я жыў у Плешчаніцах, і там непадалёк ад нашай сядзібы ляжаў вялікі валун. Я хадзіў вакол яго і думаў, колькі ён перабачыў на сваім вяку! Мяне не стане, а ён застанецца – яшчэ на тысячагоддзі. Мой улюбёны краявід – сосны, жыта і камяні. У ім – беларуская вечнасць.

– Нездарма Ніл Гілевіч адну са сваіх кнігі так і назваў – «Жыта, сосны і валуны».

– Бо Ніл Сымонавіч быў родам з нашых мясцін, з Лагойшчыны. Вось мне і захацелася стварыць вечны беларускі краявід на лецішчы ў вёсцы Перакопаўшчына Стаўбцоўскага раёна. Навёз камянёў, размясціў іх адпаведным чынам перад весніцамі. А знаёмыя мастакі на трох камянях намалявалі бел-чырвона-белы сцяг, «Пагоню» і сцяг Еўрасаюза. Апошнім часам я заўважыў, што людзі прыходзілі паглядзець на мае камяні, якія нікому не перашкаджалі. Але нядаўна ў нас мост невялічкі зрабілі праз рэчку Гавяжнянку (прыток Нёмана). І, відаць, як яго адкрывалі, нехта ўбачыў мае камяні.

– А вы ў гэты час былі на лецішчы?

– Не, у Мінску. І здарылася так, што дзеці захварэлі на кавід, і я паехаў у Перакопаўшчыну на самаізаляцыю. Прыехаў, а міліцыянт (не ўчастковы, таго я ведаю) фатаграфуе мае камяні і пратакол складае! Потым павезлі мяне ў Стоўбцы. Патрымалі ў РАУСе і накіравалі ў ІЧУ. А ў мяне – тэмпература, падазрэнне, што падхапіў вірус. З ізалятара павезлі ў бальніцу. Доктар агледзеў і напісаў у даведцы, што мяне катэгарычна нельга трымаць у шматлюднай камеры. Але рэкамендацыя доктара для міліцыянтаў – пусты гук. Мяне ўсё ж пакінулі ў ІЧУ, у шасцімеснай камеры. Праўда, чатырох чалавек тут жа выселілі, а са мной пакінулі нейкага на выгляд бамжа.

– Вы ўсё ж дэпутат Вярхоўнага Савета 12-га склікання, асоба вядомая. Як да вас ставіліся ў тым ІЧУ?

– О, тут цікава было. Мне з сакамернікам раптам выдалі новую бялізну – ручнікі, прасціны, падушкі, коўдры, нават паперу туалетную. Калі дзверы зачыніліся, ён здзівіўся: «Што адбываецца? Ніколі такога на было» (а ён сядзелец са стажам). Леглі спаць. І тут раптам святло ў камеры пагасла. Бомж ізноў здзівіўся – на яго памяці святло гарэла заўсёды, днём і ноччу. А я падсмейваюся: «Відаць, лямпачка перагарэла». Ведаеце, я сядзеў у ізалятары на Акрэсціна неаднаразова – не параўнаць…

– На судзе вы атрымалі немалы штраф – 30 базавых (870 рублёў). Суддзя Стаўбцоўскага раёна Вікторыя Суднік кваліфікавала вашы дзеянні як «пикетирование путем размещения герба «Погоня» и бело-красно-белого флага на камнях». Гэта яшчэ большае дурноцце, чым прысуд за шкарпэткі не тых колераў. Суддзя разумела, што выставіла сябе на пасмешышча?

– Адразу хачу сказаць, што мае суткі за кратамі і штраф – гэта нявартая ўвагі дробязь у параўнанні з прысудамі другім людзям – даюць жа па 5–7 гадоў калоніі. Што да паводзін суддзі… Разумееце, у нашай краіне цалкам дэфармавалася ўяўленне, што такое добра і што такое дрэнна. Чаму суддзі прымаюць рашэнні, якіх не павінны прымаць? Спадарыня Суднік разумела ж, што мае камяні ляжалі некалькі гадоў, як і іншыя суддзі разумелі, што хтосьці набыў бел-чырвона-белыя шкарпэткі ў ЦУМе, што чалавек проста вывесіў на балконе бялізну – няважна якога колеру і ў якім парадку. Але дэфармацыя закранула і суддзяў, таму яны лёгка пераступаюць праз сваё сумленне. Гэта як хвароба. Вынесці неправамернае рашэнне – ну, неяк абыдзецца... Пайсці стукануць на кагосьці – нічога страшнага. Усе так робяць. Я глядзеў на суддзю Суднік – узростам, як мая дачка, нават маладзейшая. Я па вачах бачыў – яна разумела, што ніякага пікета на маім лецішчы не было.

– І тым не менш прызнала вас вінаватым і – аштрафавала!

– Зменіцца сітуацыя, і яна адхрысціцца ад свайго рашэння, скажа, што яе прымусілі, а ў яе дзеці малыя, маці хворая... Калі міліцыянеры везлі мяне ў Стоўбцы, то прызналіся: «У нас служба не дай Бог, мы будзем хутка сыходзіць». І ўсім сваім выглядам падкрэслівалі, што не хочуць гэтага рабіць. Разумееце, калі чалавек не мае ніякіх каштоўнасцяў у душы, ён замяняе іх матэрыяльным здабыткам – крэдытам, узятым на будаўніцтва дома, службовай кватэрай, заробкам. І калі ты застаешся ў сістэме, ты павінен выконваць яе загады, а калі сыходзіш, то страчваеш усё. Мне самому давялося прайсці праз нешта падобнае. Відаць, я адзіны дэпутат Вярхоўнага Савета, які працаваў грузчыкам – два гады цягаў возікі ў краме, накручваў за дзень да 30 кіламетраў.



Сяргей Антончык выступае на Плошчы Незалежнасці.



С.Антончык – лепшы ў Беларусі вінаградар.

– Вы ў палітыцы не адно дзесяцігоддзе. З вышыні свайго досведу вы бачыце, што было зроблена не так у жніўні 2020-га?

– Два гады таму я выступаў з ініцыятывай правядзення вялікага сходу беларускай эліты. Каб сабраліся пісьменнікі, навукоўцы, мастакі, гісторыкі. Я хадзіў па ўсіх былых дэпутатах Вярхоўнага Савета 12-га і 13-га скліканняў, сустракаўся з Валянцінам Голубевым, Алегам Трусавым, Лявонам Баршчэўскім, з іншымі. Давайце правядзём сход! Не пенсіі прасіць будзем у дзяржавы, а пакажам краіне, што беларуская нацыянальная эліта існуе, і менавіта яна павінна знайсці выйсце з той палітычнай сітуацыі, у якой апынулася краіна. Усе разумелі, што пасля выбараў будуць масавыя пратэсты, але сход сабраць так і не ўдалося. Пратэсты адбыліся, але выйсця ніхто не прапанаваў. Чаму, напрыклад, у Мінску не быў утвораны камітэт, які патрабаваў бы ад Мінгарвыканкама гукаўзмацняльную апаратуру і сцэну, каб выступалі людзі, агучвалі прапановы? Сотні тысяч людзей проста хадзілі і крычалі лозунгі. Гэта нармальна, але гэтага мала. Маладыя хлопцы ўтварылі папулярныя тэлеграм-каналы, але яны не разумелі, як дзейнічаць, калі вырашаецца лёс краіны. Каардынацыйная рада чакала, калі Лукашэнка перадасць ёй уладу.

– Калі вы і вашы калегі экс-дэпутаты ўсё разумелі, то чаму не дзейнічалі?

– Праз пэўны час пасля выбараў мне патэлефанаваў Уладзімір Някляеў: «Сяргей, што будзем рабіць?» А я кажу: «Позна, месца занята. Калі мы ўтворым нейкую структуру, нам скажуць: вы што, супраць Каардынацыйнай рады? Утвараць трэба было два гады таму». У выніку што адбылося? Як кажуць: не будзі ліха, хай спіць ціха. Маніфестацыі закончыліся, але яны пабудзілі ліха, якое распачало жорсткі тэрор. І тут ужо ідзе вайна не толькі з уласным народам, але і з камянямі, са шкарпэткамі, з песнямі… Прычым душыцца нацыянальная свядомасць, а не сімвал мінулых выбараў. Сімвалам выбараў былі, як памятаеце, белыя стужачкі. Сцягі з'явіліся пазней. Бо, калі беларусы прачынаюцца і ўстаюць, яны падымаюць над галовамі бел-чырвона-белы сцяг і «Пагоню» – гэта ў нашай крыві.

– Чаму такі доўгі час не спыняецца рэпрэсіўная машына? Вуліцы і плошчы пад кантролем, актывісты ў турмах, а хапуны па-ранейшаму працягваюцца.

– Дзяржаўны тэрор – як ланцуговая рэакцыя, якую цяжка спыніць. За спінай улады ўсё больш і больш злачынстваў, і тым больш павялічваецца страх – а што ж мы нарабілі?! І гэты страх гоніць уладу на новыя «подзвігі». Сілавік прыходзіць дадому: жонка бліноў напякла, дзеткі бегаюць, грошы някепскія плацяць – нібы ўсё добра. А ён кладзецца спаць і думае: «А што будзе заўтра?» І ў яго душу закрадаецца яшчэ большы страх.

– Дык гэты жах можа працягвацца да бясконцасці?

– Не можа. Усё, нават дзяржаўны тэрор, рана ці позна ўпіраецца ў эканамічную сцяну. Паліцэйская дзяржава – дарагая штука. Можна павялічваць рэпрэсіі, мардаваць грамадства, але прыходзіць момант, калі трэба сеяць – а грошай на пасяўную не хапае, калі трэба выплачваць заробкі рабочым – а завод вось-вось збанкрутуе. І вось тады ўлада будзе вымушана ўзяць курс на адлігу. Я лічу, што яна настане праз год-паўтара. Не раней.

– А што магло б выступіць паскаральнікам адліжнага працэсу?

– Ёсць, на мой погляд, такі паскаральнік, але лепш абысціся без яго. Адліга ў Беларусь можа прыйсці, як ні небяспечна, у выглядзе аб'яднання з Расіяй. Пакуль многія людзі будуць стагнаць ад рэпрэсій, яны могуць кінуцца ў любы бок, адкуль ім засвеціць паслабленне. Маўляў, няхай хоць Пуцін, няхай хоць чорт лысы, абы не Лукашэнка. І нядаўняя правакацыя з самалётам (думаю, тут не абышлося без расійскіх спецслужбаў) зроблена для таго, каб яшчэ больш загнаць у кут Лукашэнку. Пуцін, відаць, задаволены, у яго пакуль усё атрымліваецца. Беларусь трапляе пад санкцыі, збяднелыя, затэрарызаваныя людзі будуць адчайна азірацца – хто нас выратуе? І тут на тэлеэкране з'явіцца Пуцін і скажа: «Мы готовы помочь. Входите в Россию, и сразу мы подвышаем вам пенсию в 2–3 раза». Вы слухалі, пра што гаворыць «Russia Today»? Пра 9 мільёнаў братоў, якія стогнуць пад Лукашэнкам... І гэта вельмі небяспечная сітуацыя. Можна лічыць, што Лукашэнка нелегітымны, і яго подпісы нічога ня вартыя. А ён і не будзе подпіс ставіць. У выпадку яго смерці, як мы ведаем, улада пераходзіць да Савета бяспекі. А там – пераважна сілавікі, якія, як можна здагадвацца, знаходзяцца пад знешнім кіраваннем. Я не магу гэта сцвярджаць, але зразумела, што беларускія генералы прарасійскія па духу. І таму пачатковы момант паступовай здачы Беларусі – у наяўнасці.

– Але і дэкрэт аб перадачы ўлады можна прызнаць нелегітымным. Да таго ж ён супярэчыць беларускай Канстытуцыі.

– З «унутранымі» дэкрэтамі ніхто асабліва разбірацца не будзе. А далей Пуцін будзе дзейнічаць па сітуацыі. Уявіце: пры самым цяжкім становішчы ў беларускай эканоміцы кіраўнік Расіі па ўсіх каналах гаворыць: «Дорогие, родные вы наши белорусы, мы вас не бросим! Не будем теперь разбираться, хто виноват – Лукашенко или Запад…» Зноў жа, гэта ілюзія, калі мы думаем, што ўсе нашы людзі адданыя незалежнасці. Яны будуць адданыя толькі тады, калі запатрабуюць паўсюль беларускіх школ, калі загавораць па-беларуску, калі нарэшце пачуюць сваю нацыянальную эліту, якая выбудуе беларускую сістэму каштоўнасцяў.



Камень, што… зладзіў пікет.

– Як выхадзец з рабочага асяроддзя, што вы скажаце пра эканамічныя санкцыі, якія ўводзяцца супраць беларускіх прадпрыемстваў?

